Абгрунтаванне неабходнасці
прыняцця Закона Рэспублікі Беларусь
”Аб змяненні законаў па пытаннях культуры“

**1. Мэта і прававыя падставы падрыхтоўкі праекта**

Распрацоўка праекта Закона Рэспублікі Беларусь ”Аб змяненні законаў па пытаннях культуры“ (далей – праект Закона, законапраект) выклікана неабходнасцю ўдасканальвання парадку рэгулявання грамадскіх адносін, звязаных з здзейнасцю калектываў мастацкай творчасці, творчых саюзаў, увозам і вывазам культурных каштоўнасцей, аховай гісторыка-культурнай спадчыны, бібліятэчнай і музейнай справамі, народнымі мастацкімі рамёствамі, кінематаграфічнай дзейнасцю, арганізацыяй і правядзеннем культурных мерапрыемстваў, дзейнасцю прафесійных і непрафесійных (аматарскіх) і аутэнтычных фальклорных калектываў мастацкай творчасці, дзейнасцю клубных фарміраванняў, а таксама ўнясення іншых змяненняў, звязаных з практыкай прымянення Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры (далей – Кодэкс).

**2. Абгрунтаванасць выбару віду нарматыўнага прававога акта**

Праект Закона падрыхтаваны на падставе пункта 23 плана падрыхтоўкі законапраектаў на 2020 год, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2019 г. № 482, пункта 26 плана падрыхтоўкі законапраектаў на 2021 год, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2021 г. № 2, у адпаведнасці з пунктам 4 артыкула 33 Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 130-З ”О нормативных правовых актах“ (далей – Закон № 130-З).

**3. Прадмет прававога рэгулявання структурных элементаў праекта, якія змяняюць існуючае прававое рэгуляванне адпаведных грамадскіх адносін, інфармацыя аб змене канцэптуальных палажэнняў заканадаўства, інстытутаў галіны (галін) заканадаўства і прававых наступствах такой змены**

**Абгрунтаванне да артыкула 1 праекта Закона.**

**Да пункта 1.**

Пунктам 1 праекта Закона прадугледжана ўнясенне дапаўненняў і змяненняў у **артыкул 1 Кодэкса**, у якім змяшчаюцца **асноўныя тэрміны,** якія прымяняюцца ў Кодэксе, **і іх азначэнні.**

Удакладняецца вызначэнне тэрміну ”гісторыка-культурная каштоўнасць“ (падпункт 1.3 пункта 1 артыкула 1 Кодэкса) шляхам уключэння ў вызначэнне слоў ”, архітэктурныя і (або) канструктыўныя“.

Такая неабходнасць абумоўлена тым, што фізічная страта ці пашкоджанне адпаведных архітэктурных ці канструктыўных элементаў

з’яўляецца стратай тых адметных вартасцей (сводаў, сцен, лесвіц, падпружных арак, аутэнтычных перакрыццяў, архітэктурнага дэкору і г.д.), якія з’яўляюцца характэрнымі для гісторыка-культурнай каштоўнасці і з’яўляюцца падставай для ўключэння помніка архітэктуры ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (далей – Дзяржаўны спіс). Падпунктам 5.1.1 ТКП 45-1.02-295-2014 вызначана, што ўяўляе сабой архітэктурная мадэль па аб’ектах (з распрацоўкай фасадаў, папавярховых планаў, даху, дызайн-праектаў інтэр’ераў, твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва) і канструктыўная мадэль (з выкананнем неабходных разлікаў, схем і вузлоў апорных канструкцый, падмуркаў, армавання жалезабетонных элементаў). Такі падзел паказвае на тое, што канструктыўныя асаблівасці гісторыка-культурнай каштоўнасці не ўваходзяць у склад архітэктурных асаблівасцяў.

Адпаведныя дапаўненні ў мэтах забеспячэння адзінства тэрміналогіі таксама ўносяцца ў пункт 4 **артыкула 75**, пункт 6 **артыкула 91**, пункт 1 **артыкула 92**, пункт 2 **артыкула 103** і падпункт 1.3 пункта 1 **артыкула 112 Кодэкса** (пункты 22 і 27 законапраекта).

Пункт 1 **артыкула 1 Кодэкса** дапаўняецца падпунктам $1.8^1$, якім уводзіцца вызначэнне тэрміну ”культурная спадчына“. Унясенне гэтага дапаўнення з адначасовай карэктыроўкай норм **артыкулаў 68 і 83 Кодэкса** дазволіць завяршыць урэгуляванне зместу паняццяў ”гісторыка-культурная каштоўнасць“ і ”культурная каштоўнасць“, ”гісторыка-культурная спадчына“ і ”культурная спадчына“ і замацаваць іх розныя прававыя статусы.

Дапаўнені ўносяцца у падпункт 1.14 пункта 1 **артыкула 1 Кодэкса** ў мэтах удакладнення тэрміна ”творчая дзейнасць“.

Увядзенне паняцця ”частка матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці“ у пункце 1 **артыкула 1 Кодэкса** (дапаўненне падпункта 1.16 і дапаўненне пункта падпунктам 1.17) абумоўлена неабходнасцю прававога рэгулявання статусу адасобленай часткі гісторыка-культурнай каштоўнасці, у тым ліку жылых і нежылых памяшканняў у гісторыка-культурных каштоўнасцях.

Правапрымяняльная практыка з 1992 года прадугледжвае безумоўнае падпісанне ўласнікамі (карыстальнікамі) матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей ахоўных абавязацельстваў на сваю частку адпаведнай каштоўнасці, якая належыць ім і за захаваннасць якой яны нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам.

Аднак на сённяшні дзень ні Кодэкс, які з’яўляецца асноўным нарматыўным прававым актам, рэгулюючым адносіны ў сферы культуры, ні іншыя акты заканадаўства не змяшчаюць азначэння такога

паняцця, як ”частка гісторыка-культурнай каштоўнасці“, што выклікае на практыцы непаразуменні пры правапрымяненні норм Кодэкса ў частцы адказнасці не толькі за гісторыка-культурную каштоўнасць цалкам, але і за ўсе яе часткі пры падпісанні ахоўных абавязацельстваў і правядзенні работ на адпаведнай частцы.

Такім чынам, замацаванне паняцця ”частка гісторыка-культурнай каштоўнасці“ у Кодэксе прапанавана каб падцвердзіць практыку выканання абавязкаў уласнікаў (карыстальнікаў) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, землекарыстальнікаў, на зямельных участках якіх размешчана нерухомая матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць або яе частка.

***Даведачна.*** *На цяперашні час у Дзяржаўны спіс уключана больш за 5,5 тыс. гісторыка-культурных каштоўнасцей.*

**Да пункта 2.**

Змяненні ў **назву главы 2 і артыкул 4 Кодэкса** ўносяцца ў сувязі с неабходнасцю ўдакладнення норм у адпаведнасці з Законам № 130-З і Законам Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 г. № 421-З ”О международных договорах Республики Беларусь“. Законапраектам прапануецца іншая фармуліроўка для абазначэння крыніц рэгулявання адносін у сферы культуры. Да крыніц рэгулявання адносін у сферы культуры таксама аднесены міжнародна-прававые акты, складаючыя права Еўразійскага эканамічнага саюза, якія, напрыклад, непасрэдна прымяняюцца пры рэгуляванні пытанняў ўвозу і вывазу культурных каштоўнасцей.

***Даведачна.*** *У цяперашні час у актах заканадаўства Рэспублікі Беларусь выкарыстоўваюцца два тэрміна для вызначэння права Еўразійскага эканамічнага саюза:*

*1) фармулёўка ”и правом Евразийского экономического союза“ выкарыстоўваецца ў мэтах вызначэння крыніц прававога рэгулявання ў Законе Рэспублікі Беларусь ад 5 верасня 1995 г. № 3848-XII ”Об обеспечении единства измерений“ (пункт 1 артыкула 2 новай рэдакцыі названага Закона, акт уступіў у сілу 27 лістапада 2020 г.);*

*2) фармулёўка ”международно-правовыми актами, составляющими право Евразийского экономического союза“ выкарыстоўваецца па тэксце Бюджэтнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (артыкулы 106 і 108) і ў мэтах вызначэння крыніц прававога рэгулявання ў Законе Рэспублікі Беларусь ад 24 кастрычніка 2016 г. № 437-З ”Об оценке соответствия техническим требованиям и аккредитации органов по оценке соответствия“ (пункт 1 артыкула 2).*

**Да пункта 3.**

Назва **главы 3 Кодэкса** выкладаецца ў новай рэдакцыі ў сувязі з прапануемым праектам Закона ўключэннем у склад гэтай главы

артыкула, якім рэгулююцца пытанні кантроля ў сферы культуры (пункт 8 законапраекта).

**Да пункта 4.**

Змяненні ў **артыкул 8 Кодэкса** ўносяцца ў мэтах забеспячэння адзінства тэрміналогіі ў часцы прымянення словазлучэння ”традыцыі народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва“ замест ”традыцыі народных мастацкіх рамёстваў“. Адпаведныя змяненні таксама ўносяцца ў артыкулы главы 20 ”НАРОДНЫЯ МАСТАЦКІЯ РАМЁСТВЫ“ (пункты 79 – 87 законапраекта).

**Да пункта 5.**

Пуктам 1 артыкула 32 Закона № 130-З прадугледжана, што найменні дзяржаўных органаў у тэксце нарматыўнага прававога акта ўказваюцца без слоў ”Рэспублікі Беларусь“, таму змяненні ўносяцца ў **артыкул 10 Кодэкса** ў часцы выключэння з гэтага артыкула адпаведных слоў.

**Да пункта 6.**

**Артыкул 13 Кодэкса** дапаўняецца абзацам, згодна якому Міністэрству культуры надаюцца паўнамоцтвы запытваць і атрымоўваць з дзяржаўных інфармацыйных сістэм (рэсурсаў) дзяржаўных органаў і арганізацый на бязвыплатнай аснове інфармацыю па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Міністэрства культуры.

Атрыманне інфармацыі па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны неабходна Міністэрству культуры для належнага выканання абавязкаў па фарміраванню і вядзенню Дзяржаўнага спісу, а таксама абавязкаў па арганізацыі і правядзенню мерапрыемстваў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны (абзац дзясяты артыкула 13 Кодэкса). Гісторыка-культурная спадчына ўключае ў сябе аб’екты нерухомай маёмасці, дакладныя звесткі аб якіх павінны утрымлівацца ў Дзяржаўным спісе. Такія звесткі неабходны для аб’ектыўнага, усебаковага і поўнага разгляду дакументаў і матэрыялаў, якія паступаюць у Міністэрства культуры ад грамадзян і юрыдычных асоб па самаму шырокаму спектру пытанняў аховы гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама ў мэтах актуалізацііі Дзяржаўнага спіса.

Разам з тым, на сённяшні дзень, пры накіраванні адпаведных запытаў у органы-аператары дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў, якія валодаюць запытанымі звесткамі і інфармацыяй, у тым ліку аб гісторыі змянення адрасоў месцазнаходжання, прыходзіць адмова ад прадастаўлення такой інфармацыі з тлумачэннем, што паўнамоцтвы на запыт Міністэрствам культуры такой інфармацыі на бязвыплатнай аснове не прадугледжаны заканадаўчым актам (у тым ліку артыкулам 13

Кодэкса). Для ўрэгулявання дадзенай сітуацыі пунктам 5 законапраекта прадугледжана адпаведнае дапаўненне.

**Да пункта 7.**

Паўнамоцтвы мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў (пункт 1 **артыкула 14 Кодэкса**) дапоўняюцца паўнамоцтвамі па забеспячэнні гэтымі органамі выканання ўстаноўленых праектамі зон аховы рэжымаў утрымання і выкарыстання тэрыторый і зон аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей, і фарміраванні імі рэгіянальных комплексаў мерапрыемстваў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў рамках рэалізацыі дзяржаўных праграм (згодна з Палажэннем аб парадку фарміравання, фінансавання, выканання і ацэнкі эфектыўнасці рэалізацыі дзяржаўных праграм, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 ліпеня 2016 г. № 289), і забеспячэнні іх выканання на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі. Гэтыя дапаўненні дазволяць замацаваць у Кодэксе паўнамоцтвы мясцовых органаў, неабходныя ім для вырашэння такога праблемнага пытання ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны, як забяспячэнне ўзаемадзейнасці па пытанням аховы гісторыка-культурнай спадчыны на тэрытарыяльным узроўні і павялічыць аб’ёмы фінансавання на гэтыя мэты за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў, якія былі агучаны ў Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця да 2035 г., а таксама ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021 – 2025 гады.

**Да пункта 8.**

З пункта 2 артыкула 18 словы ”алімпіяды і“ выключаюцца ў мэтах забеспячэння адпаведнасці з актамі Главы дзяржавы, вызначаючымі меры па падтрымцы таленавітай моладзі і стварэнні ўмоў для яе плённай дзейнасці. Гэтымі актамі правядзенне алімпіяд для выяўлення таленавітай моладзі не прадугледжваецца.

**Да пунктаў 9 і 10.**

Згодна з пунктам 5 Указа № 510 грамадскі кантроль у форме правядзення праверак маюць права ажыццяўляць прафесійныя саюзы, іх арганізацыйныя структуры, аб’яднанні такіх саюзаў і іх арганізацыйныя структуры. Ажыццяўленне грамадскага кантролю ў форме правядзення праверак другімі арганізацыямі, акрамя прызначаных, а таксама фізічнымі асобамі забараняецца. Таму ў мэтах устаранення супярэчнасці з Указам № 510 артыкул 20 выключаецца з главы 4 Кодэкса.

Выключэнне артыкула 20 з главы 4 Кодэкса цягне змяненне структурных элементаў заканадаўчага акта, а менавіта: глава 4 выключаецца, а артыкул, які датычыцца пытанняў кантролю ў сферы

культуры, выкладзены ў новай рэдакцыі, далучаецца да главы 3 шляхам яе дапаўнення артыкулам 18[1].

**Да пункта 11.**

У **артыкул 25 Кодэкса** ўносіцца дапаўненне ў мэтай прававога замацавання існуючай практыкі па страхаванню дарагастоячай і ўнікальнай дзяржаўнай маёмасці дзяржаўных арганізацый культуры, дзяржаўных установ адукацыі ў сферы культуры за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, сродкаў, атрыманых ад ажыццяўлення дзейнасці, якая прыносіць даходы, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Асобныя дзяржаўныя арганізацыі культуры, дзяржаўныя ўстановы адукацыі ў сферы культуры змяшчаюцца ва ўнікальных пабудовах, маюць рэдкія каштоўныя выданні, рукапісы, рарытэтныя прадметы, музычныя інструменты, абсталяванне, якія адносяцца да дарагастоячай і ўнікальнай дзяржаўнай маёмасці. У мэтах забяспячэння захавання названай дзяржаўнай маёмасці нароўні з іншымі мерамі (заключэнне адпаведнага дагавора аб аказанні Дэпартаментам аховы Міністэрства ўнутраных спраў ахоўных паслуг па ахове аб’ектаў (маёмасці) юрыдычных асоб), а таксама ўлічваючы, што названая маёмасць набыта за кошт сродкаў бюджэту, законапраектам прапануецца замацаваць права дзяржаўных арганізацый культуры, дзяржаўных устаноў адукацыі ў сферы культуры ажыццяўляць страхаванне такой маёмасці, у тым ліку за кошт сродкаў бюджэта.

Неабходна адзначыць, што такое страхаванне не з’яўляецца абавязковым.

Паміж тым у адпаведнасці з пастановай Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь ад 31.12.2008 № 208 «О бюджетной классификации Республики Беларусь» страхаванне дарагастоячай і ўнікальнай дзяржаўнай маёмасці адлюстоўваецца па параграфу 950, а таму неабходныя сродкі прадугледжваюцца пры іх планаванні.

У сувязі з чым прыняцце Закона Рэспублікі Беларусь ”Аб змяненні законаў па пытаннях культуры“ не паўплывае на змяненне велічыні даходаў і расходаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.

Ажыццяўленне страхавання маёмасці дазваляе ў выпадку наступлення страхавой падзеі (пажара, наваднення, другога стыхійнага бедства, аварыйнай сітуацыі, неправамерных дзеянняў трэціх асоб, раскрадання) атрымаць пакрыццё матэрыяльнага ўрону, прычыненага дадзенай падзеяй, што садзейнічае найхутчэйшаму ўзнаўленню (адбудове) стану маёмасці дзяржаўнай арганізацыі культуры, дзяржаўнай установы адукацыі ў сферы культуры.

Страхаванне ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб страхавой дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, зацверджанным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 2006 г. № 530.

**Да пункта 12.**

Змены ўносяцца ў **артыкулы 30, 32 і 188 Кодэкса** ў мэтах забеспячэння адзінства тэрміналогіі з улікам змяненняў, якія ўносяцца ў артыкул 4 Кодэкса.

**Да пункта 13.**

Практыка прымянення Кодэкса з 2017 г. выявіла праблемы ў трактаванні нормаў, якія датычацца прадастаўлення ільгот пры наведванні (карыстанні паслугамі) арганізацый культуры, аб’ектаў культурнай інфраструктуры. Таму ў мэтах удакладнення змяненне ўносіцца ў падпункт 3.2 пункта 3 **артыкула 35 Кодекса** (аналагічнае змяненне ўносіцца таксама ў **артыкул 8 Кодэкса** (пункт 4 законапраекта).

**Да пункта 14.**

Нормы пункта 1 **артыкула 43 Кодэкса** прыводзяцца ў адпаведнасць з пунктам 2 артыкула 1 Закона № 130-З у часцы узгаднення тэрміна ”лакальныя прававыя акты“.

**Да пункта 15.**

У мэтах забеспячэння ўнутранай узгодненасці з іншымі нормамі Кодэкса, якія датычацца дзейнасці аўтэнтычнага фальклорнага калектыва мастацкай творчасці (артыкулы 49 і 236 Кодэкса) пункт 5 **артыкула 44 Кодэкса** ўдакладняецца нормай, якая пазначае магчымасць кіраўніка аўтэнтычнага фальклорнага калектыва мастацкай творчасці займацца мастацкай творчасцю на прафесійнай аснове (у выпадку, калі аўтэнтычны фальклорны калектыў мастацкай творчасці з’яўляецца клубным фарміраваннем, якое створана ў якасці падраздзялення юрыдычнай асобы, кіраўнік калектыва ажыццяўляе сваю дзейнасць на падставе працоўнага дагавора (кантракта).

**Да пункта 16.**

У пункт 4 **артыкула 46 Кодэкса** ўносяцца дапаўненні, якія дазволяць удасканаліць работу па вядзенню пашпарта непрафесійнага (аматарскага) калектыву мастацкай творчасці. Так, канкрэтызуюцца звесткі аб знаходжанні пашпарта і яго захаванні.

**Да пункта 17.**

**Артыкулы 48 і 49 Кодэкса** выкладаюцца ў новай рэдакцыі ў мэтах удакладнення падстаў для ажыццяўлення дзейнасці ўдзельнікамі калектываў мастацкай творчасці кожнага віду (прафесійнага, непрафесійнага (аматарскага), аўтэнтычнага фальклорнага), а таксама пытанняў кіравання ў калектывах мастацкай творчасці.

Літаральнае прачытанне дзеючай рэдакцыі артыкулаў 48 і 49 Кодэкса спараджае змешванне паняццяў ”кіраўнік арганізацыі“ і ”кіраўнік калектыву“. Гэта адбываецца ў сілу складанасці прававой прыроды аб’екта рэгулявання - калектыву мастацкай творчасці - разнастайнасці відаў, жанраў, форм і статусаў дадзеных калектываў, а таксама магчымых варыянтаў іх спалучэння.

Праектам Закона прапануецца ў рамках Кодэкса ажыццяўляць рэгуляванне дзейнасці кіраўніка калектыву як спецыяліста ў сферы культуры, не закранаючы пры гэтым пытанні дзейнасці кіраўніка арганізацыі, якія рэгулююцца працоўным і грамадзянскім заканадаўствам.

Таксама, як і ў дзеючай рэдакцыі артыкула 48 Кодэкса, для ўдзельнікаў прафесійнага калектыва мастацкай творчасці, захоўваецца магчымасць ажыццяўляць сваю дзейнасць на падставе грамадзянска-прававога дагавора. Гэта неабходна, напрыклад, у выпадку патрэбнасці разавай замены ўдзельніка прафесійнага калектыва мастацкай творчасці, які ажыццяўляе сваю дзейнасць на падставе працоўнага дагавора (кантракта), па прычыне яго хваробы, або ў выпадку неабходнасці прыцягнення дадатковых удзельнікаў для арганізацыі адначасовага выступлення калектыву ў розных месцах. Як правіла, такім чынам прыцягваюцца да разавых выступленняў былыя ўдзельнікі (работнікі) прафесійнага калектыва мастацкай творчасці, якія добра ведаюць рэпертуар, але ўжо не знаходзяцца ў працоўных адносінах з калектывам (заснавальнікам калектыва).

**Да пункта 18.**

У пункт 4 **артыкула 51 Кодэкса** ўносяцца змяненні ў частцы выключэння падпункта 4.3 бо за перыяд, якія прайшоў з часу прыняцця Кодэкса, у Рэспубліцы Беларусь асобны тып арганізацый народных мастацкіх рамёстваў, зыходзячы з падыхода вызначэння прадукцыі, якая можа быць аднесена да вырабаў народных мастацкіх рамёстваў, не можа існаваць.

У адпаведнасці з артыкулам 187 Кодэкса аднясенне прадукцыі арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў і рамеснікаў да вырабаў народных мастацкіх рамёстваў праводзіцца экспертнай камісіяй па аднясенні прадукцыі да вырабаў народных мастацкіх рамёстваў. Таму на мамент вырабу прадукцыі гаворыць аб тым, што гэтая прадукцыя з’яўляецца вырабам народных мастацкіх рамёстваў не магчыма, што у сваю чаргу цягне немагчымасць адзначэння арганізацыі, якая вырабляе гэтую прадукцыю, як арганізацыі народных мастацкіх рамёстваў.

**Да пункта 19.**

У мэтах пашырэння магчымасцей развіцця творчых саюзаў праектам Закона прапануецца зафіксаваць права творчых саюзаў на ажыццяўленне акрамя творчай дзейнасці іншай культурнай дзейнасці па напрамкам, прадугледжанным артыкулам 79 Кодэкса. Адпаведныя дапаўненні ўносяцца у **артыкул 59 Кодэкса.**

**Да пункта 20.**

Глава 11 Кодэкса дапоўняецца **артыкулам 63[1]**, якім замацоўваецца практыка размяшчэння творчымі саюзамі майстэрняў (творчых майстэрняў), галерэй, выставачных залаў, студый, лабараторый (творчых лабараторый).

Гэта неабходна для ліквідацыі прававой нявызначанасці ў першую чаргу паняцця ”творчая майстэрня“ пры рэгуляванні арэндных адносін і прымяненні нормаў Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 сакавіка 2012 г. № 150 ”О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом“ (далей – Указ № 150). Так, згодна з падпунктам 1.1.2 пункта 1 дадатка 2 да Палажэння аб парадку вызначэння памеру арэнднай платы пры здачы ў арэнду капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), ізаляваных памяшканняў, машына-месцаў, іх частак, зацверджанага Указам № 150, пры разліку стаўкі арэнднай платы да базавай стаўцы прымяняюцца каэфіцыент 0,1 за плошчы, арандаваныя творчымі саюзамі, іх арганізацыйнымі структурамі з правамі юрыдычнай асобы для размяшчэння майстэрняў, галерэй, выставачных залаў, студый, лабараторый, да 100 кв.метраў уключна.

Разам з тым, пры ажыццяўленні кантролю з боку кантралюючых і праваахоўных органаў узнікаюць пытанні, звязаныя з інтэр’ерамі, абстаноўкамі памяшканняў, у якіях змяшчаюцца майстэрні, галерэі, выставачныя залы, студыі, лабараторыі, аб дарэчнасці знаходжання ў дадзеных памяшкання асобных прадметаў мэблі, абсталявання, інвентара і іншых рэчаў. Каб урэгуляваць дадзеныя пытанні праектам Закона прапануецца дапоўніць Кодэкс адпаведнымі нормамі.

**Да пункта 21.**

Змяненні **ў артыкулы 65 і 107 Кодэкса** ўносяцца ў мэтах забеспячэння адзінства тэрміналогіі ў часцы прымянення словазлучэння ”традыцыі народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва“ замест ”традыцыі народных мастацкіх рамёстваў“. Адпаведныя змяненні таксама ўносяцца ў **артыкул 8 і ў артыкулы главы 20** ”НАРОДНЫЯ МАСТАЦКІЯ РАМЁСТВЫ“ **Кодэкса** (пункты 79 – 87 законапраекта).

**Да пункта 22.**

У **артыкул 68 Кодэкса** ўводзіцца новы тэрмін і яго азначэнне ”комплексная гісторыка-культурная каштоўнасць“ у мэтах дэталізацыі і размежавання аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны і ліквідацыі прабелу ў прававым рэгуляванні адпаведных адносін.

**Да пункта 23.**

Абзац шосты **артыкула 74** Кодэкса дапаўняецца словамі ”, за выключэннем выпадкаў, калі гэтыя аб’екты знаходзіліся ў іх карыстанні на 3 лютага 2017 г.“ у сувязі з неабходнасцю зафіксаваць існуючае палажэнне асобных матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія на момант уступлення ў сілу Кодэкса і да цяперашняга часу знаходзяцца ў карыстанні Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, іншых войск і воінскіх фарміраванняў Рэспублікі Беларусь.

**Да пункта 24.**

У мэтах забеспячэння адзінства тэрміналогіі з улікам удакладнення, якое ўносіцца ў падпункт 1.3 пункта 1 артыкула 1 Кодэкса (шляхам уключэння слоў ”архітэктурныя і (або) канструктыўныя“), адпаведныя змяненні ўносяцца ў пункт 4 **артыкула 75,** пункт 2 **артыкула 103** і падпункт 1.3 пункта 1 **артыкула 112 Кодэкса.**

**Да пункта 25.**

У мэтах прывядзення нормаў **артыкула 76 Кодэкса**, які рэгулюе парадак увозу і (або) вывазу культурных каштоўнасцей, у адпаведнасць з міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, актуалізацыі яго зместу, прапанавана новая рэдакцыя гэтага артыкула.

У прыватнасці, Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь надаецца права вызначаць парадак, умовы выдачы заключэння (дазвольнага дакумента) на вываз культурных каштоўнасцей, уключаных у адзіны пералік тавараў, да якіх прымяняюцца меры нетарыфнага рэгулявання ў гандлі з трэцімі краінамі, які вызначаецца актам, што складае права Еўразійскага эканамічнага саюза (далей – адзіны пералік тавараў), пісьмовага паведамлення аб тым, што заключэнне (дазвольны дакумент) на вываз культурнай каштоўнасці не патрабуецца, а таксама падставы для адмовы ў выдачы заключэння (дазвольнага дакумента) згодна з пунктам 20 Палажэння аб вывазе з мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза культурных каштоўнасцей, дакументаў нацыянальных архіўных фондаў і арыгіналаў архіўных дакументаў (дадатак № 8 да Рашэння Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі ад 21 красавіка 2015 г. № 30).

Таксама прапанаваны механізм дэцэнтралізацыі выдачы пісьмовых паведамленняў аб тым, што заключэнне (дазвольны дакумент)

не патрабуецца, для атрымання якога юрыдычная асоба, грамадзянін, у тым ліку індывідуальны прадпрымальнік, маюць права звярнуцца ў Міністэрства культуры або структурнае падраздзяленне абласных выканаўчых камітэтаў і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-уладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, ці ўпаўнаважанную імі па ўзгадненні з Міністэрствам культуры арганізацыю культуры. Такі падыход дазваляе зменьшыць адміністрацыйную нагрузку на заяўнікаў, дае магчымасць больш эфектыўна ажыццяўляць розлічны гандаль сучаснымі творамі мастацтва пры правядзенні буйных рэгіянальных культурных мерапрыемстваў, на якіх фіксуецца значны турыстычны паток грамадзян, якія не толькі пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, але і за яе межамі. Такое размеркаванне дазволіць павысіць турыстычны патэнцыял прымежных рэгіёнаў, у якіх уведзены безвізавы рэжым.

**Да пунктаў 26 – 56.**

Унясенне змяненняў у артыкулы Кодэкса, якія рэгулююць пытанні **аховы гісторыка-культурнай і археалагічнай спадчыны**, выклікана неабходнасцю ўдасканальвання парадку надання культурным каштоўнасцям статусу гісторыка-культурных каштоўнасцей і пазбаўлення іх такога статусу, а таксама карэктыроўкі асобных норм гэтых артыкулаў Кодэкса, звязаных з практыкай іх прымянення.

Унясенне дапаўнення ў **артыкул 83 Кодэкса** з адначасовай карэктыроўкай норм артыкулаў 1 і 68 Кодэкса дазволіць завяршыць урэгуляванне зместу паняццяў ”гісторыка-культурная каштоўнасць“ і ”культурная каштоўнасць“, ”гісторыка-культурная спадчына“ і ”культурная спадчына“ і замацаваць іх розныя прававыя статусы.

Унясенне змяненняў у **артыкулы 84, 90, 93, 94, 96, 97 і 98 Кодэкса** звязана з пераглядам паўнамоцтваў дзяржаўных органаў па наданні культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці і пазбаўленню такога статусу шляхам замацавання гэтых паўнамоцтваў за адным дзяржаўным органам-рэгулятарам – Міністэрствам культуры.

***Даведачна.*** *З моманту ўступлення ў сілу Кодэкса Дзяржаўны спіс пашырыўся 60 новымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, з якіх статус гісторыка-культурнай каштоўнасці 41 культурнай каштоўнасці быў нададзены Міністэрствам культуры і толькі 19 – аблвыканкамамі, у тым ліку 2 – Брэсцкім аблвыканкамам, 4 – Віцебскім аблвыканкамам, 8 – Гомельскім аблвыканкамам, 3 – Магілёўскім аблвыканкамам, 2 – Мінскім аблвыканкамам. Гомельскі аблвыканкам і Мінскі гарвыканкам не прынялі ні аднаго рашэння аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.*

Як паказвае практыка з 2017 года аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам амаль не ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны па ажыццяўленню мер, накіраваных

на вылучэнне культурных каштоўнасцей для надання культурным каштоўнасцям статусу гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Унясенне адпаведных змяненняў у парадак разгляду прапаноў аб наданні культурным каштоўнасцям статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, а таксама прапаноў аб пазбаўленні гісторыка-культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці дазволіць павысіць эфектыўнасць дзяржаўнай палітыкі ў гэтай сферы.

З улікам адзначанага, а таксама на падставе практыкі прымянення з 1992 года ўносяцца ўдакладненні па вызначэнню раздзелаў Дзяржаўнага спіса і замацоўваюцца нормы аб парадку яго вядзення, вызначаныя падпунктамі 5.13 і 5.14 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40, згодна з якімі пры ўнясенні змяненняў у звесткі аб гісторыка-культурных каштоўнасцях Дзяржаўнага спіса захоўваецца дата і нумар рашэння дзяржаўнага органа аб наданні культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

У мэтах удасканалення парадку пашырэння беларускіх аб’ектаў спадчыны ў спісах Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА пункт 2 **артыкула 99 Кодэкса** дапаўняецца часткай, якой прадугледжваецца, што падрыхтоўку прапановы аб уключэнні гісторыка-культурнай каштоўнасці ў пералік каштоўнасцей культурнай і прыроднай спадчыны, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, якія могуць быць уключаны ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны, або Спіс сусветнай спадчыны, якая знаходзіцца пад пагрозай, забяспечвае мясцовы выканаўчы і распарадчы орган абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню, на тэрыторыі якога знаходзіцца дадзеная гісторыка-культурная каштоўнасць, шляхам унясення ўзгодненай з Міністэрствам культуры прапановы ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Вызначэнне гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія могуць быць прапанаваны для ўключэння ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны, Спіс сусветнай спадчыны, якая знаходзіцца пад пагрозай, або ў іншыя спісы ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Прапановы аб уключэнні гісторыка-культурных каштоўнасцей ў вышэйназваныя спісы ўносяцца ў Урад Рэспублікі Беларусь

у выглядзе праекта пастановы, які ўзгадняецца ў парадку, устаноўленым Законам № 130-З.

З улікам передачы ў мэтах спрашчэння парадку выканання работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях катэгорыі “3” паўнамоцтваў Міністэрства культуры на ўзровень абласных (Мінскага гарадскога) выканкамаў па ўзгадненню навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях (артыкул 119 дзеючай рэдакцыі) і выдачы заключэння аб адпаведнасці прымаемай у эксплуатацыю нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях дапаўняюцца паўнамоцтвы абласных (Мінскага гарадскога) саветаў па пытаннях па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны.

Паўнамоцтвы, адпаведныя паўнамоцтвам Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны, у адносінах да аб’ектаў спадчыны катэгорыі “3”, замацоўваюцца ў пункце 6 артыкула 84 Кодэкса.

Акрамя таго ў мэтах замацавання адзіных падыходаў да парадку фарміравання і дзейнасці гэтых саветаў праектам Закона прадугледжваецца, што ў склад саветаў па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны па ўзгадненню з Міністэрствам культуры ўключаюцца асобы, якія, як правіла, валодаюць неабходным узроўнем ведаў і вопытам работы ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны, з якіх не менш трох асоб маюць вышэйшую адукацыю ў сферы архітэктуры і будаўніцтва, а таксама зацвярджэнне Палажэння аб саветах па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пастановай Міністэрства культуры.

У **артыкулах 100 і 104 Кодэкса** словы ”комплекс або ансамбль матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей“ замяняюцца словамі ”комплексныя гісторыка-культурныя каштоўнасці“ у сувязі з удакладненнем наймення гісторыка-культурных каштоўнасцей з улікам увядзення ў Кодэкс гэтага новага паняцця і яго азначэння (у артыкул 68 Кодэкса).

У пункце 7 артыкула 100 Кодэкса таксама, зыходзячы з правапрымяняльнай практыкі норм Кодэкса, павялічваецца тэрмін унясення у пашпарт матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці змяненняў упаўнаважанымі мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі базавага тэрытарыяльнага ўзроўню ў выпадку змянення звестак аб гісторыка-культурных каштоўнасцях асобы да сямі календарных дзён.

Пункт 1 **артыкула 104 Кодэкса** дапаўняецца нормай аб забароне зносу (дэмантажу) нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных

каштоўнасцей. Згодна з палажэннямі падпункта 1.1 пункта 1 артыкула 103 і пункта 1 артыкула 104 Кодэкса па прапанове Міністэрства культуры ў праект Кодэкса аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці таксама ўключана такая норма.

Унясенне змяненняў у пункт 2 артыкула 104 Кодэкса зроблена з мэтай выключэння разгляду перамяшчэння гісторыка-культурных каштоўнасцей як крайняй меры, не звязанай з новым асваеннем гістарычных тэрыторый, калі рашэнне прапануецца без уліку захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей, а дзеля магчымасці ўзвядзення на гістарычным месцы новых аб’ектаў. Такі прынцып супярэчыць асноўным палажэнням, прыведзеным у артыкулах 8 і 82 Кодэкса, а таксама ўводзінам Канвенцыі аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ад 16 лістапада 1972 года.

Зацверджаныя Міністэрствам культуры ва ўстаноўленым парадку праекты зон аховы выяўляюць немагчымасць падзялення тэрыторый комплексных гісторыка-культурных каштоўнасцей на асобныя часткі, якія гістарычна звязаны. Такое падзяленне прывядзе да стварэння шматлікіх праектаў зон аховы замест аднаго, агульнага. Раздзяленне на асобныя праекты зон аховы не дазволіць забяспечыць выкананне пункта 1 **артыкула 105 Кодэкса**. У гэтай сувязі прапануецца выкласці пункт 2 артыкула 105 у новай рэдакцыі.

”2. Для комплексных нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей устанаўліваюцца агульныя зоны аховы.

Для нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія размешчаны побач, могуць устанаўлівацца агульныя зоны аховы.

Да зацвярджэння праектаў зон аховы помнікаў археалогіі на іх тэрыторыях, пазначаных у рэестры археалагічных аб’ектаў, які вядзецца ў парадку, устаноўленным пунктамі 1-3 артыкула 125 гэтага Кодэкса, а таксама на адлегласці 50 метраў ад вонкавых межаў гэтых тэрыторый, пры выкананні земляных, меліяратыўных і іншых відаў работ, здольных нанесці шкоду помніку археалогіі, павінны выконвацца меры, прадугледжаныя артыкулам 129 гэтага Кодэкса.“.

Лічым неабходным падтрымаць пазіцыю Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь у частцы неабходнасці ўстанаўлення для ўсіх помнікаў археалогіі да распрацоўкі праектаў зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей базавага (мінімальнага) памеру зон аховы.

Дадзеная мера ўводзіцца з мэтай захавання, вывучэння і выключэння пашкоджання помнікаў археалогіі, прымаючы да ўвагі асаблівасці такіх аб'ектаў. Неабходна адзначыць, што такія межы базавай (рэзервіруемай) ахоўнай зоны помнікаў археалогіі адпавядаюць межам зон, якія ў далейшым вызначаюцца праектамі зон аховы (50 м у абодвух выпадках).

Памер прапаноўваемых базавых зон аховы (50 м для помнікаў археалогіі) вызначаны на падставе праведзенага аналізу рэалізаваных археалагічных даследаванняў, выкананага пры падрыхтоўцы праекта Кодэкса ў 2015-2016 гг., і ўстаноўлены па выяўленым археалагічным аб'ектам і археалагічным артэфактам у межах 50-ці метровай зоны ад помнікаў археалогіі.

Міністэрствам культуры сумесна з зацікаўленымі дадаткова прапрацавана аналагічная прапанова Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь у частцы ўстанаўлення базавых (мінімальных) межаў зон аховы для помнікаў архітэктуры і помнікаў горадабудаўніцтва (будынкаў і збудаванняў, гістарычных цэнтраў гарадоў).

Дзеючым заканадаўствам замацаваны патрабаванні па выключэнні рэалізацыі любых работ, якія могуць фізічна і візуальна ўздзейнічаць на гісторыка-культурныя каштоўнасці, без захавання рэгламентаў праектаў зон аховы (пункт 6 артыкула 105 Кодэкса, пункт 2 артыкула 6 Закона аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, абзац другі падпункта $11^1$ пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 8 кастрычніка 2008 г. № 1476).

Для помнікаў архітэктуры і помнікаў горадабудаўніцтва – будынкаў, збудаванняў, аб'ектаў планіровачнай структуры, вызначэнне межаў зон аховы магчыма толькі на падставе навуковых даследаванняў: горадабудаўнічага аналізу тэрыторыі, стратыграфічных даследаванняў яе гістарычнага развіцця, якаснай і колькаснай ацэнкі складу гістарычнай забудовы, наяўнасці дысгарманічных аб'ектаў, ландшафтнага аналізу.

Пры распрацоўцы праектаў генеральных планаў пры наяўнасці гісторыка-культурных каштоўнасцей на тэрыторыі населенага пункта выконваецца апорны гісторыка-архітэктурны план. На чарцёж генеральнага плана наносяцца межы зоны аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей, зацверджаныя пастановамі Міністэрства культуры. Пры гэтым на чарцяжы апорнага гісторыка-архітэктурнага плана рэзервуюцца тэрыторыі, якія ўлічваюцца і ўдакладняюцца на наступных этапах дэталёвага праектавання. У тым ліку:

тэрыторыі, прылеглыя да гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія рэзервуюцца пад ахоўную зону;

тэрыторыі, якія рэзервуюцца пад зону рэгулявання забудовы;

тэрыторыі, якія рэзервуюцца пад зону аховы ландшафту.

Дадаткова прапісваюцца рэкамендацыі (мерапрыемствы) па рэжыму ўтрымання і выкарыстання названых тэрыторый да моманту распрацоўкі і зацвярджэння праектаў зон аховы на наступных этапах праектавання.

Лічым неабходным адзначыць, што ўвядзенне базавых межаў зон аховы для помнікаў архітэктуры акрамя іх ўмоўнасці, прывядзе да скасавання патрабаванняў па распрацоўцы праектаў зон аховы. Такое ўвядзенне можа справакаваць практыку карыстання базавымі межамі, без распрацоўкі праектаў зон аховы.

З улікам выкладзенага ўключэнне ў праект Кодэкса патрабаванняў па ўстанаўленні базавых (мінімальных) памераў зон аховы для помнікаў архітэктуры і помнікаў горадабудаўніцтва не прадстаўляецца магчымым.

Тэрмін ”тэрыторыя нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей“ ужываецца ў палажэннях артыкула 105 Кодэкса, але не мае вызначэння. Тэрмін ”тэрыторыя нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей“ уводзіцца з мэтай вызначэння характарыстык асноўных комплексных гісторыка-культурных каштоўнасцей – гістарычных цэнтраў, ансамбляў, комплексаў, сядзібаў, паркаў, неад’емнай часткай якіх з’яўляецца гістарычная тэрыторыя.

У мэтах устанаўлення адзіных патрабаванняў да распрацоўкі праектаў зон аховы артыкул 105 Кодэкса дапаўняецца новым пунктам.

Шэрагавая гістарычная забудова з’яўляецца часткай навакольнага асяроддзя і вызначаецца праектамі зон аховы, як забудова якая стварае гістарычны характар тэрыторый на адным узроўні з аб’ектамі, якія ўключаны ў Дзяржаўны спіс. Акрамя таго, гэтыя аб’екты маюць адметныя духоўныя, дакументальныя, архітэктурныя вартасці і могуць быць прапанаваны для ўключэння ў Дзяржаўны спіс ва ўстаноўленым парадку. З гэтай мэтай пункт 4 артыкула 105 Кодэкса дадаецца неабходнымі словамі.

**Артыкул 109 Кодэкса** выкладаецца ў новай рэдакцыі ў сувязі з наступным.

Адсутнасць у існуючай рэдакцыі Кодэкса тэрміна ”навуковае абгрунтаванне“, разам з тым, што спасылка на гэты тэрмін адзначана ў пункце 3 артыкула 84, пункце 1 артыкула 103, пункце 1 артыкула 104, пунктах 1 і 2 артыкула 109 Кодэкса. Неабходна адзначыць, што ў дзеючай рэдакцыі Кодэкса тэрміналогія ў цэлым прадстаўлена недастаткова, што, з прычыны спецыфічнасці многіх тэрмінаў у сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны (якія нідзе больш не вызначаны), прыводзіць да памылковага трактавання асноўных паняццяў і стварае

супярэчнасці ў працэсе ўзгаднення навукова-праектнай дакументацыі ў адпаведнасці з палажэннямі артыкула 119 Кодэкса, а таксама ў ходзе выканання работ.

У мэтах спрашчэння парадку правядзення работ па забеспячэнні належнага стану матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей дэцэнтралізуецца кампетэнцыя па прыняцці заключэнняў аб прызнанні змяненняў нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, прадугледжаных навукова-праектнай дакументацыяй, навукова абгрунтаванымі або навукова не абгрунтаванымі, у залежнасці ад катэгорый гэтых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Так, да кампетэнцыі абласных (Мінскага гарадскога) савета па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны аднесена прыняцце заключэнняў аб прызнанні змяненняў нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей катэгорый ”3“, прадугледжаных навукова-праектнай дакументацыяй, навукова абгрунтаванымі або навукова не абгрунтаванымі. У адносінах да нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей катэгорый ”0“, ”1“ і ”2“, захоўваецца кампетэнцыя Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры.

У мэтах урэгулявання размяшчэння сродкаў вонкавай рэкламы на гісторыка-культурных каштоўнасцях з часткі другой пункта 3 **артыкула 110 Кодэкса** выключаюцца словы ”, як правіла,“.

Размяшчэнне сродкаў вонкавай рэкламы менавіта асобнымі літарамі толькі мінімізуе, але пры гэтым канчаткова не ліквідуе перашкоды для ўспрымання архітэктурнага рашэння фасада помніка архітэктуры. Такім чынам норма Кодэкса аб размяшчэнні на фасадах помнікаў архітэктуры рэкламы асобнымі літарамі з’яўляецца кампрамісным выключэннем з поўнай забароны на яе размяшчэнне на помніках архітэктуры, якая дазваляе мінімізаваць пагаршэнне ўспрымання архітэктурна-мастацкага рашэння фасадаў, створаных па задумцы архітэктара ў пэўную гістарычную эпоху. У сваю чаргу, наяўнае выключэнне ”як правіла, асобнымі літарамі“ было зафіксавана распрацоўшчыкамі Кодэкса ў мэтах нераспаўсюджвання ўведзеных Кодэксам (пункт 3 артыкула 110) патрабаванняў (абмежаванняў) на сродкі вонкавай рэкламы, размешчаных да 3 лютага 2017 года.

***Даведачна.*** *Згодна з пунктам* $17^1$ *Палажэння аб парадку размяшчэння сродкаў вонкавай рэкламы, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12 лістапада 2007 г. № 1497, тэрмін дзеяння дазволу на размяшчэнне тэхнічна складанага сродку вонкавай рэкламы (наддахавай рэкламнай канструкцыі, прызматрона, лайтпостэра з плошчай рэкламнага поля*

*больш 2,16 квадратнага метра, шчыта з плошчай рэкламнага поля больш за 32 квадратных метраў, шчыта, электроннага табло і іншага), аб'ёмна-прасторавай рэкламнай канструкцыі павінен складаць не менш за пяць гадоў, на размяшчэнне лайтпостэраў з плошчай рэкламнага поля да 2,16 квадратнага метра ўключна, шчытоў з плошчай рэкламнага поля да 32 квадратных метраў ўключна, пілонаў і іншых сродкаў вонкавай рэкламы, якія замацоўваюцца на зямельным участку, – не менш за тры гады.*

З улікам таго, што ў дазволе на размяшчэнне сродку вонкавай рэкламы вызначаны пэўны тэрмін, то ў гэты перыяд (пазначаны ў дазволе тэрмін) умовы ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці не павінны змяняцца. Такім чынам, распрацоўшчыкамі захаваны прынцып нераспаўсюджвання зваротнай сілы патрабаванняў (абмежаванняў), уведзеных Кодэксам.

У сувязі з тым, што заканадаўствам аб культуры дазваляецца рэалізацыя толькі навукова абгрунтаваных рашэнняў, праектная дакументацыя павінна адпавядаць навукова-даследчым вышуканням. Навукова-даследчыя вышуканні маюць прыкладную мэту, у адпаведнасці з якой прымаюцца тыя ці іншыя праектныя рашэнні. Навукова-даследчыя вышуканні ўключаюцца ў склад праектнай дакументацыі пры выкананні работ на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях для ацэнкі адпаведнасці праекта вышуканням. Гэта пацвярджае неабходнасць унясення змяненняў у пункт 2 **артыкула 113 Кодэкса**.

З мэтай удакладнення правядзення рамонтна-рэстаўрацыйных работ, а таксама спрашчэння правядзення работ па забеспячэнні належнага тэхнічнага і санітарнага стану гісторыка-культурных каштоўнасцей карэктуецца **артыкул 114 Кодэкса** шляхам выкладання ў новай рэдакцыі.

Беларусь, як краіна, якая ратыфікавала Канвенцыю аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны 1972 года, прыняла абавязкі па захаванні аб'ектаў спадчыны з улікам Рэкамендацый па выкананню гэтай канвенцыі і іншых міжнародных дагавораў у гэтай сферы (Венецыянская хартыя 1965 года, Нарскі дакумент 1994 года і іншыя дагаворы), якімі адзначана неабходнасць захавання сапраўднасці помніка, як аднаго з асноўных яго адзначэнняў.

З мэтай удакладнення некаторых тэрмінаў, а таксама ўдакладнення работ, якія ажыццяўляюцца пры рэстаўрацыі аб'ектаў, прапануюцца адпаведныя змяненні ў падпункты 1.1 – 1.10 пункта 1 **артыкула 114 Кодэкса.**

Пры выкладанні новай рэдакцыі тэрміну ”рэгенерацыя“ словы ”(у асноўным комплексу або ансамбля матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей)“ выключаюцца ў сувязі з тым, што дзеючая

рэдакцыя гэтага тэрміна з’яўляецца недакладнай. Рэгенерацыя можа распрацоўвацца для любых гісторыка-культурных каштоўнасцей, зыходзячы з існуючай горадабудаўнічай сітуацыі.

Тэрмін ”рэканструкцыя“ выкладаецца ў новай рэдакцыі з улікам норм праекта Кодекса аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці. Тэрмінам ”рэканструкцыя“, які прадугледжаны праектам Кодекса аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, указана на магчымасць дэмантажа не меньш за 80% канструкцый будынкаў, што пры выкананні работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях прывядзе да фактычнай страты помніка архітэктуры. Такія дзеянні супярэчаць патрабаванням Кодэкса. Рашэнні па змяненні асноўных тэхніка-эканамічных паказчыкаў і параметраў, у тым ліку з павышэннем спажывецкіх якасцей, змяненне колькасці і плошчы памяшканняў, будаўнічага аб’ёму і (або) агульнай плошчы на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей не могуць прымацца без навуковага абгрунтавання такіх рашэнняў. Галоўная мэта прыстасавання аб’екта спадчыны – яго захаванне за кошт выкарыстання. На гісторыка-культурных каштоўнасцях функцыя адпавядае помніку, а не помнік функцыі. Функцыі, якія вядуць да навукова неабгрунтаваных змяненняў гісторыка-культурных каштоўнасцей, не адпавядаюць нормам заканадаўства аб культуры.

Азначэнне тэрміна ”рэстаўрацыя“ фармулявалася ў мэтах адпавядання міжнароднай практыцы. Па міжнародных нормах у сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны аднаўленне першапачатковага погляду гісторыка-культурнай каштоўнасці не з’яўляецца мэтай рэстаўрацыі. Наадварот, такія дзеянні вядуць да страт гістарычна значных напластаванняў помніка архітэктуры (станоўчыя прыклады – Каложская царква ў г.Гродна, Спаса-Праабражэнская царква ў г.Полацку, адмоўны – страта аўтэнтычнасці пры правядзенні работ на Старым замку ў г.Гродна).

У мэтах забеспячэння захаванасці гісторыка-культурных каштоўнасцей пры выкананні работ па бягучым рамонце ў **артыкуле 114 Кодэкса** прапануецца прадугледзець, што гэтыя работы павінны выконвацца пры ажыццяўленні аўтарскага нагляду, пры гэтым для спрашчэння парадку вызначаецца, што работы па бягучым рамонце на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях ажыццяўляюцца на падставе праграмы работ без распрацоўкі праектнай дакументацыі.

Новай рэдакцыяй **артыкула 116 Кодэкса** ў перыяд ажыццяўлення кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных

гісторыка-культурных каштоўнасцях, навукова-метадычнага кіраўніцтва пры выкананні рамонтна-рэстаўрацыйных работ, аўтарскага нагляду пры выкананні рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях у межах выканання работ устанаўліваецца забарона замены грамадзяніна, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, які ажыццяўляе кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, навукова-метадычнае кіраўніцтва пры выкананні рамонтна-рэстаўрацыйных работ, аўтарскі нагляд пры выкананні рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях. Устанаўленне гэтай забароны абумоўлена тым, што змена грамадзяніна, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, які мае пасведчанне на кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, у ходзе выканання асобных работ на помніках вядзе да адсутнасці адказнасці гэтым спецыялістам за ход работ і, як вынік, страты помнікам яго адметных вартасцей. Разам з тым, улічваючы розныя жыццёвыя сітуацыі, прадугледжваюцца выпадкі выключэнняў.

Таксама ў новай рэдакцыі гэтага артыкула змяшчаецца забарона на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях без ажыццяўлення аўтарскага нагляду. Устанаўленне гэтай забароны неабходна для фіксацыі фактаў адсутнасці ажыццяўлення аўтарскага нагляду на адпаведных аб’ектах для магчымасці прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці заказчыкаў за парушэнне парадку і (або) умоў выканання работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, прадугледжанай артыкулам 20.2 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, паколькі на практыцы выяўляюцца такія выпадкі.

У пункце 13 **артыкула 117 Кодэкса** словы ”шэсць месяцаў“ прапануецца замяніць словамі ”два гады“. Павялічэнне срокаў дазволіць павысіць адказнасць грамадзяніна, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, які мае пасведчанне на кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, за прапануемыя да ўзгаднення рашэнні і выкананне абавязкаў, прадугладжаных Кодэксам.

У мэтах неабходнасці дадатковага ўдзелу грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, якія маюць пасведчанне на кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі

на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, пры правядзенні работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях з мэтай паляпшэння якасці названых работ прапанавана карэкціроўка **артыкула 118 Кодэкса**.

**Артыкул 119 Кодэкса** выкладаецца ў новай рэдакцыі.

У артыкул уключаецца азначэнне тэрміна ”навукова-праектная дакументацыя на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ“ з мэтай аднастайнага разумення і прымянення нарматыўных прававых прадпісанняў Кодэкса.

Праектам Закона з узроўню Міністэрства культуры на ўзровень мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню спускаюцца працэдуры ўзгаднення навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях катэгорыі ”3“, а таксама выдачы заключэння аб адпаведнасці прымаемай у эксплуатацыю нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях – у дачыненні да нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей катэгорый ”3“.

Дадзеная норма накіравана на спрашчэнне і дэцэнтралізацыю існуючай практыкі ўзгаднення навукова-праектнай дакументацыі і выдачы заключэння пры прыняцці ў эксплуатацыю нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, якая зараз ажыццяўляецца Міністэрствам культуры.

Такім чынам, разгляд навукова-праектнай дакументацыі на месцы і знаёмства з аб’ектам спадчыны перад прыняццем яго ў эксплуатацыю мясцовым органам абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню па месцу знаходжання аб’екта спадчыны будзе спрыяць спрашчэнню адзначаных адміністрацыйных працэдур для гісторыка-культурных каштоўнасцей катэгорыі ”3“.

***Даведачна:*** *На сённяшні дзень у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь уключана 5350 нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, з якіх 4684 маюць катэгорыю “3”, што складае 87% ад агульнай колькасці такіх каштоўнасцей.*

Прадугледжаны ў праекце закона падыход адпавядае задачам, прадугледжаным у раздзеле IV “Паслугі ў сферы культуры” Праграмы дзейнасці Ўрада Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2025 года, зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 24.12.2020 № 758.

Такім чынам, замацаванне адзначаных адміністрацыйных працэдур за выканкамамі для нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей катэгорыі “3” дазволіць спрасціць парадак правядзення работ па забеспячэнню належнага стану гісторыка-культурных каштоўнасцей, прадугледжанага названай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

У адносінах да нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей катэгорыі ”0“, ”1“ і ”2“ кампетэнцыя Міністэрства культуры па ўзгадненню навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ захоўваецца.

Увядзенне новага суб’екта ў адносіны па ўзгадненню навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях змяняе структуру артыкула і цягне неабходнасць выкладання яго ў новай рэдакцыі.

У сувязі з тым, што ўласнікамі (карыстальнікамі) гісторыка-культурных каштоўнасцей з’яўляюцца не толькі юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі, а таксама і грамадзяне, якія не з’яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, у мэтах удакладнення кола асоб, якім магчыма выдача заключэння аб адпаведнасці прымаемай у эксплуатацыю нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, адпаведныя змяненні ўносяцца ў пункт 2 **артыкула 120 Кодэкса**.

***Даведачна.*** *21% гісторыка-культурных каштоўнасцей знаходзіцца ва ўласнасці фізічных асоб.*

У пункт 3 **артыкула 122 Кодэкса** ўносяцца змяненні, якімі прадугледжана выключэнне слоў ”Рэспублікі Беларусь“ у мэтах выканання патрабаванняў Закона № 130-З у частцы выкарыстання найменне войск і воінскіх фарміраванняў у тэксце нарматыўнага прававога акта з улікам складзенай нарматворчай практыкі (аналагічныя змяненні ўносяцца таксама ў абзац шосты **артыкула 74 Кодэкса**).

Улічваючы, што помнікі археалогіі не могуць з’яўляюцца археалагічнымі артэфактамі, таму ў мэтах удакладнення дзеючай рэдакцыі тэрміна ”археалагічная спадчына“ ў **артыкул 123 Кодэкса** ўносяцца тэхнічныя змяненні шляхам выкладання яго ў новай рэдакцыі.

Змяненні у пункце 4 **артыкула 125 Кодэкса** маюць рэдакцыйны характар.

У мэтах прывядзення норм **артыкула 127 Кодэкса** ў адпаведнасць з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 чэрвеня 2021 г. № 240 ”Об административных процедурах, осуществляемых в отношении

субъектов хозяйствования“ змяненні ўносяцца ў пункты 2 і 5 гэтага артыкула.

У **артыкуле 129 Кодэкса** замацоўваецца выключэнне з агульнага правіла, згодна з якім пры выкананні на помніках археалогіі земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, ажыццяўленні іншай дзейнасці на тэрыторыі археалагічных аб’ектаў, якія не з’яўляюцца рамонтна-рэстаўрацынымі работамі, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі ў парадку, ёй устаноўленым, прызначаецца адказны за захаванне гісторыка-культурнай каштоўнасці, распрацоўку мер па ахове помніка археалогіі і археалагічнага нагляду. У гэтым выпадку ўдзел грамадзяніна, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, які мае пасведчанне на кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, не патрабуецца.

Адсутнасць неабходнасці ўдзелу спецыяліста, які мае пасведчанне на кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, абумоўлена тым, што адказнасць нясе спецыяліст-археолаг па адкрытаму лісту Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

У **артыкуле 130 Кодэкса** ўдакладняецца парадак узгаднення горадабудаўнічых праектаў. Так, законапраектам прапануецца ўстанавіць парадак, пры якім горадабудаўнічыя праекты, якія змяшчаюць звесткі аб археалагічных аб’ектах, у тым ліку помніках археалогіі, падлягаюць узгадненню з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, а горадабудаўнічыя праекты, якія змяшчаюць звесткі аб іншых гісторыка-культурных каштоўнасцях, падлягаюць узгадненню з Міністэрствам культуры. Дадзеныя ўзгадненні з’яўляюцца арганізацыйнымі мерамі, накіраванымі на ўтрыманне і збяражэнне гісторыка-культурнай і археалагічнай спадчыны.

**Да пунктаў 57 – 66.**

Унясенне змяненняў у артыкулы Кодэкса, якія рэгулююць пытанні **бібліятэчнай справы**, выклікана наступнымі прычынамі.

Сучасная бібліятэка, з’яўляючыся шматфункцыянальнай арганізацыяй культуры, ажыццяўляе работу па сацыякультурнай дзейнасці. Дадзеная функцыя адлюстравана ў вызначэнні прапануемага тэрміна ”бібліятэчны работнік“ у **артыкуле 132 Кодэкса.**

Прапановы па змяненню **артыкула 138 Кодэкса** абумоўлены тым, што сёння многія бібліятэкі займаюцца алічбоўкай сваіх дакументаў з мэтай забеспячэння захаванасці аўтэнтычных арыгіналаў.

У сувязі з тым, што ў рамках аптымізацыі структуры ўстановы ”Галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтр Міністэрства адукацыі

Рэспублікі Беларусь“ было прынята рашэнне аб ліквідацыі структурнага падраздзялення дадзенай установы адпаведныя змяненні ўносяцца ў **артыкул 139 Кодэкса.**

З мэтай забеспячэння захаванасці бібліятэчных фондаў, у тым ліку кніжных помнікаў і іншых найбольш каштоўных дакументаў, і рэгламентацыі іх уліку, лічым мэтазгодным унесці змяненні ў **артыкул 145 Кодэкса** ў частцы дапаўнення спосабаў фарміравання страхавога фонду такім спосабам як алічбоўка. Таксама змяненні ўносяцца ў пункт 7 гэтага артыкула, каб замацаваць кампетэнцыю Міністэрства культуры на вызначэнне парадку арганізацыі бібліятэчных фондаў і выключэнні з іх дакументаў замест вызначэння толькі форм ўліковых дакументаў. Правапрымяняльная практыка выявіла неабходнасць вызначэння адзінага для ўсіх бібліятэк парадку арганізацыі бібліятэчных фондаў.

Карэкціроўка пункта 1 **артыкула 146 Кодэкса** звязана з тым што сёння сэрвісы міжбібліятэчнага абанемента здзяйсняюцца праз розныя формы бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання на аснове ўзаемавыкарыстання інфармацыйных і даведачна-бібліяграфічных рэсурсаў бібліятэк. Бібліятэкі прадстаўляюць дакументы або фрагменты дакументаў на розных носьбітах у часовае або пастаяннае карыстанне. Электронная дастаўка дакументаў з’яўляецца складанай часткай міжбібліятэчнага абанемента.

У пункце 1 **артыкула 147 Кодэкса** даецца вызначэнне дакументаабмена і пераразмеркавання дакументаў толькі як бязвыплатнай перадачы з адной бібліятэкі іншай бібліятэцы для папаўнення фонду. Практыка прымянення гэтай нормы значна шырэй. Дакументаабмен і пераразмеркаванне дакументаў можа здзяйсняцца не толькі паміж бібліятэкамі, але паміж бібліятэкамі і іншымі суб’ектамі культурнай дзейнасці, установамі адукацыі, якія не адносяцца да суб’ектаў культурнай дзейнасці, арганізацыімі, якія аказваюць сацыяльныя паслугі, або рэлігійнымі арганізацыямі, якія зацікаўлены ў папаўненні іх фондаў. Таму адпаведныя дапаўненні ўносяцца ў азначэнне тэрміну ”дакументаабмен і пераразмеркаванне дакументаў“.

Бібліятэкі забяспечваюць абслугоўванне карыстальнікаў праз глабальную камп’ютэрную сетку Інтэрнэт. Таму ў паўсядзённае жыццё бібліятэкараў і ў дзяржаўную статыстыку ўвайшло такое паняцце, як віртуальны (аддалены) карыстальнік. З мэтай павышэння мабільнасці і цыфравізацыі сферы аказання паслуг бібліятэкамі, а таксама абароны аўтарскіх праў і сумежных праў прапануецца ўнесці адпаведныя змены ў **артыкулы 148 і 150 Кодэкса.**

**Да пунктаў 67 – 79.**

У артыкулы Кодэкса, якія рэгулююць пытанні **музейнай справы**, уносяцца наступныя змяненні.

Удакладняюцца нормы падпунктаў 2.10 і 2.11 пункта 2 **артыкула 154 Кодэкса** ў частцы выкарыстання паняццяў ”нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці“ і ”нематэрыяльныя культурныя каштоўнасці“.

У мэтах аднясення макетаў і муляжоў біялагічных і геалагічных аб’ектаў і іншых прыродазнаўчых гістарычных прадметаў не да рэчавага тыпу, а да адпаведных прыродазнаўчых калекцый і удакладнення тэрміналогіі Кодэкса прапануецца ўнясенне змяненняў у **артыкул 155 Кодэкса.**

Для забеспячэння дзейнасці музеяў ствараецца вялікая колькасць камісій і саветаў, якія зараз не акрэслены ў Кодэксе, у сувязі з чым спатрэбілася карэкціроўка **артыкулаў 157, 159, і 178 Кодэкса**.

У мэтах выключэння рознага тлумачэння нарматыўных прававых прадпісанняў і ліквідацыі ўнутраных супярэчнасцяў прапануецца карэкціроўка пунктаў 1 і 2 **артыкула 164 Кодэкса** ў частцы замацавання за музеямі абавязкаў устанаўлення правілаў наведвання і абслугоўвання наведвальнікаў.

Згодна з пунктам 4 артыкула 161 Кодэкса музеі класіфікуюцца па профілях: гістарычны, прыродазнаўчы, мастацкі, літаратурны. У гэтай сувязі падпункт 2.1 пункта 2 **артыкула 165 Кодэкса** прыводзіцца ў адпаведнасць з класіфікацыяй музеяў.

Змяненні, якія ўносяцца ў пункт 5 **артыкула 166 Кодэкса**, выкліканы неабходнасцю забеспячэння адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 ліпеня 2021 г. № 258 ”Об официальных геральдических символах“.

Дапаўненнем ў пункт 2 **артыкула 176 Кодэкса** замацоўваецца кампетенцыя музеяў на распрацоўку уласных (унутрымузейных) інструкцый аб парадку ўліку, каталагізацыі, навуковай апрацоўцы і захоўвання музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў. Гэта дазволіць замацаваць абавязковасьць наяўнасці лакальнага прававога акта, які рэгламентуе названыя пытанні, у мэтах

Улічана прапанова Гродзенскага аблвыканкама, Рэспубліканскага савета дырэктараў музеяў аб ўдакладненні выкарыстання фармуліроўкі ”права бясплатнага (ільготнага) наведвання музея“ у **артыкуле 181 Кодэкса.**

**Артыкул 184 Кодэкса** выкладаецца ў новай рэдакцыі з мэтай удакладнення парадку падрыхтоўкі навукова-праектнай дакументацыі і пераліку дакументаў, якія накіроўваюцца на рэцэнзаванне адпаведным

арганізацыям, а таксама ўстанаўліваецца неабходнасць рэцэнзавання архітэктурна-мастацкага рашэння пастаяннай экспазіцыі.

Змяненні ў **артыкул 185 Кодэкса** ўносяцца ў мэтах удакладнення тэрміналогіі (падпункты 2.1 і 2.2 артыкула) і парадку стварэння часовых экспазіцый з улікам практыкі іх работы.

**Да пунктаў 80 – 88.**

Унясенне змяненняў у артыкулы Кодэкса, якія рэгулююць пытанні **народных мастацкіх рамёстваў**, абумоўлена наступным.

З улікам мэтазгоднасці надання асобных гарантый развіцця рамесліцкай дзейнасці ў накірунку мастацкіх традыцый у пункце 2 **артыкула 187 Кодэкса** паняцце ”традыцыі народных мастацкіх рамёстваў“ замяняецца паняццем ”традыцыі народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва“. Пры гэтым, першаснае значэнне надаецца мастацкім традыцыям, якія праяўляюцца праз вобразы, выявы, іншыя мастацкія сродкі выразнасці, якія забяспечваюць нацыянальную самабытнасць, выцясняючы традыцыі рамесніцкай дзейнасці, якія абапіраюцца ў першую чаргу на віды рамесніцкай дзейнасці, тэхнікі і тэхналогіі вырабу прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога прызначэння.

Адпаведныя змяненні ў мэтах забеспячэння адзінства тэміналогіі ў часцы выкарыстання паняцця ”традыцыі народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва“ унесены таксама ў **артыкулы 8, 65, 107, 189, 191, 193, 195 – 197 Кодэкса.**

Змяненні ў пункце 4 артыкула 187 Кодэкса дазволяць удасканаліць вызначэнне арганізацый, якія могуць займацца вытворчасцю прадукцыі, якая можа быць аднесена да вырабаў народных мастацкіх рамёстваў, і арганізацый культуры, якія заклікаены ствараць умовы для заняткаў мастацкай творчасцю. Так, не любая арганізацыя, прадукцыя якой аднесена да вырабаў народных мастацкіх рамёстваў, з’яўляецца арганізацыяй народных мастацкіх рамёстваў, а тым больш арганізацыяй культуры. У сувязі з выключэннем з артыкула 51 Кодэкса такога тыпа арганізацыі культуры як арганізацыя народных мастацкіх рамёстваў **артыкул 192 Кодэкса** выключаецца і ўносяцца змяненні ў **артыкулы 187, 193, 194 і 197 Кодэкса.**

У абзац шосты **артыкула 188 Кодэкса** змяненні ўносяцца ў мэтах забеспячэння адзінства тэрміналогіі з улікам змяненняў, якія ўносіцца ў артыкулы 4 і 76 Кодэкса ў частцы выкарыстання фармулёўкі ”міжнародна-прававыя акты, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза“.

Змяненні і дапаўненні ў **артыкул 189 Кодэкса** заклікаены ўдасканаліць парадак надання статусу народнага майстра. Так, называюцца ўмовы, пры якіх статус народнага майстра можа быць

нададзены майстру народных мастацкіх рамёстваў (новая рэдакцыя пункта 5), адзначаецца, што статус народнага майстра можа быць нададзены грамадзяніну, які стварае творы мастацкай вартасці інсітнага (наіўнага) выяўленчага, графічнага, дэкаратыўнага, скульптурнага мастацтва, творчасць якога характарызуецца выразнай нацыянальнай самабытнасцю, арганічным увасабленнем калектыўнага мастацкага вопыту беларускага народа (новая рэдакцыя пункта 6).

Таксама ў залежнасці ад узросту асобы канкрэтызуецца пэўны перыяд, на які ей можа быць нададзены статус народнага майстра. Пры гэтым у мэтах гарантыі паслядоўнай і сістэмнай працы ў галіне народнай творчасці асобы, якой аднойчы гэты статус быў нададзены, законапраектам прапануецца прадугледзець трохгадовы тэрмін дзеяння статусу (дапаўненне артыкула пунктам $6^1$).

Заключэнне экспертнай камісіі па народных мастацкіх рамёствах аб наданні статусу народнага майстра прапануецца замацоўваць рашэннем Міiністэрства культуры, якое павінна быць прынята не пазней за трыццаць каляндарных дзён з дня выдачы заключэння аб наданні статусу народнага майстра (новая рэдакцыя пункта 9).

**Да пунктаў 89 - 94.**

Унясенне змяненняў у артыкулы Кодэкса, якія рэгулююць пытанні **кінематаграфічнай дзейнасці,** выклікана наступнымі прычынамі.

Змяненні ўносяцца ў **артыкулы 202, 204 і 205 Кодэкса** ў мэтах забеспячэння адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 красавіка 2021 г. № 146”О развитии кинематографии“.

У **артыкуле 203 Кодэкса** карэктуюцца тэрміны ”фільм“ і ”фільм у анімацыйнай форме“ шляхам устанаўлення дадатковых патрабаванняў (выверанасць сюжэта і драматургічнай канструкцыяй, пазначанасць мастацкімі вобразамі) да твораў, якія могуць быць аднесены да фільмаў, фільмаў у анімацыйнай форме.

Замацоўваецца норма, згодна з якой фільм у анімацыйнай форме можа мець да 5 працэнтаў элементаў ігравога або неігравога фільма.

Змяненні ў **артыкулы 206 і 207 Кодэкса** выкліканы прапановамі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, падтрыманымі Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніяй Рэспулікі Беларусь, закрытым акцыянерным таварыствам ”Другі нацыянальны тэлеканал“, рэспуліканскім унітарным прадпрыемствам электрасувязі ”Белтэлекам“, Тэлекамунікацыйным галіновым саюзам.

Грунтуючыся на палажэннях пунктаў 5 – $5^2$ артыкула 17 Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2008 г. № 427-З ”О средствах массовой информации“ (далей – Закон № 427-З), якія прадстаўляюць магчымасць

распаўсюджвання ў Рэспубліцы Беларусь прадукцыі замежнага сродку масавай інфармацыі без змены формы або зместу пасля атрымання замежным сродкам масавай інфармацыі на гэта дазволу ў рэспубліканскім органе дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі (частка першая пункта 5), распаўсюджвання, у прадугледжаных выпадках, прадукцыі без знака ўзроставай катэгорыі (пункт $5^1$, часткі першая і другая пункта $5^2$), а таксама нормах Палажэння аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 верасня 2010 г. № 450 ”О лицензировании отдельных видов деятельности“ (пункт $125^2$), законапраектам прапануецца ў **артыкулах 206 і 207 Кодэкса** адлюстраваць выпадкі, калі магчымы паказ фільмаў без ажыццяўлення іх класіфікацыі і ўключэння ў Дзяржаўны рэгістр фільмаў.

Так, па аналогіі з абзацам чатвертым частцы першай пункта $5^2$ артыкула 17 Закона № 427-З, якім дазваляецца без ажыццяўлення классіфікацыі распаўсюджваць у Рэспубліцы Беларусь прадукцыю замежнага сродку масавай інфармацыі без змены формы або зместу, у **артыкулах 206 і 207 Кодэкса** прадугледжваецца дазвол ажыццяўляць паказ фільмаў, якія з’яўляюцца складальнай часткай тэлепраграм, у тым ліку замежных тэлепраграм, і распаўсюджваюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь без змены формы і зместу распаўсюджвальнікамі прадукцыі тэлевізійных сродкаў масавай інфармацыі, без правядзення іх класіфікацыі і ўключэння ў Дзяржаўны рэгістр фільмаў.

Паколькі фільмы, якія дэманструюцца па тэлебачанню, фактычна з’яўляюцца часткай телепраграмм, **артыкулам 207 Кодэкса** надаецца права юрыдычным асобам, на якія ўскладзены функцыі рэдакцый тэлевізійных сродкаў масавай інфармацыі, ажыццяўляць классіфікацыю фільмаў, якія гэтыя юрыдычныя асобы плануюць паказваць, у адпаведнасці з парадкам прысваення інфармацыйнай прадукцыі знака ўзроставай катэгорыі, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. У сувязі з тым, што ўнясенне дадзеных змяненняў тэхнічна складана для ўспрымання, **артыкул 207 Кодэкса** выкладаецца у новай рэдакцыі.

**Да пунктаў 95 – 104.**

Глава 22 Кодэкса, у якой рэгулюецца пытанні арганізацыі і правядзенні **культурных мерапрыемстваў**, змяняецца з улікам аналізу практыкі работы па арганізацыі і правядзенні культурна-відовішчных мерапрыемстваў, а таксама прапаноў упраўленняў культуры (галоўных упраўленняў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі) аблвыканкамаў, Мінгарвыканкама, тэатральна-відовішчных арганізацый

рэспубліканскага падпарадкавання. Так праектам Закона прапануюцца наступныя змяненні.

У **артыкуле 209 Кодэкса** культурные мерапрыемства называюцца ў паслядоўнасці, прадугледжанай наступнымі артыкуламі главы 22 (новая рэдакцыя пункта 2); размяжоўваюцца паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаўных органаў, вызначаных арганізатарамі цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў ў частцы рэгулявання парадку правядзення культурных мерапрыемстваў, вызначаецца орган, упаўнаважаны на прыняцце ведамаснага нарматыўнага прававога акта, які замацоўвае парадак арганізацыі і правядзення культурнага мерапрыемства, пры наяўнасці некалькіх арганізатараў (новая рэдакцыя пункта 5).

У падпункце 4.3 пункта 4 **артыкула 209 Кодэкса** уводзіцца азначэнне тэрміну ”запрашальны білет на наведванне культурнага мерапрыемства“ у мэтах ліквідацыі прававога прабелу. У цяперашні час у заканадаўстве аб культуры адсутнічае азначэнне паняцця ”запрашальны білет“, што выклікае цяжкасці пры ажыццяўленні фінансавай дзейнасці арганізатараў культурных мерапрыемстваў і ў ходзе кантроля за яе ажыццяўленнем з боку кантралюючых і праваахоўных органаў. Удакладняецца, што арганізатар таксама пры неабходсці можа вызначаць кола асоб, якім плануецца ўручаць запрашальныя білеты на наведванне культурнага мерапрыемства, звесткі, якія павінен утрымліваць запрашальны білет; ставіцца, што запрашальны білет на наведванне культурнага мерапрыемства акрамя звестак, вызначаных арганізатарам культурнага мерапрыемства, павінен утрымліваць надпіс ”Продажу не падлягае“. Адпаведныя дапаўненні таксама адлюстраваны ў падпункце 3.6 пункта 3 **артыкула 211 Кодэкса**.

У **артыкуле 213 Кодэкса** ўдакладнена азначэнне асоб, якія адносяцца да беларускіх выканаўцаў, а таксама дадзена азначэнне паняцця ”культурна-відовішчнага мерапрыемства, якое праводзіцца для ўласных патрэб“.

У **артыкуле 214 Кодэкса** у мэтах стымулявання дзейнасці дзяржаўных арганізацый культуры па правядзенні культурна-відовішчных мерапрыемстваў і з улікам шматлікіх зваротаў ад кіраўнікоў гэтых арганізацый дзяржаўным арганізацыям культуры прадастаўлена права правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў без атрымання пасведчанняў на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (далей – пасведчанні). Таму адпаведныя змяненні ўносяцца ў падпункт 4.2 пункта 4: уключаюцца словы ”, дзяржаўныя арганізацыі культуры“ і выключаюцца словы ”, установа ”Беларуская дзяржаўная ордэна

Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія“, ”, абласныя філармоніі, дзяржаўная установа ”Мінскканцэрт“ (гэтыя ўстановы адносяцца да дзяржаўных арганізацый культуры і паглынаюцца дадзеным тэрмінам).

Праектам Закона таксама прадугледжана, што ў выпадку арганізацыі культурна-відовішчнага мерапрыемства некалькімі арганізатарамі, адзін з якіх вызвалены ад атрымання пасведчання, іншыя арганізатары таксама вызваляюцца ад атрымання пасведчання.

У сувязі са змяненнем Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь дзяржаўныя арганізацыі культуры для арганізацыі культурна-відовішчных мерапрыемстваў вымушаны браць пасведчанне, а таксама плаціць пошліну за яго атрыманне, калі ў мерапрыемстве прымае ўдзел замежны выканаўца. Дадзеная практыка дрэнна ўплывае на рэпертуар калектываў, іх пазабюджэтную дзейнасць. Вызваленне дзяржаўных арганізацый культуры ад атрымання пасведчання станоўча паўплывае на выкананне паказчыкаў дзяржаўнай праграмы ”Культура Беларусі“ і павышэнне ўзроўню даходаў ад пазабюджэтнай дзейнасці.

У **артыкуле 215 Кодэкса,** зыходзячы з правапрымянальнай практыкі і ўнасімых змяненняў у артыкул 216 Кодэкса, ўдакладняюцца падставы для адмовы ў выдачы пасведчання на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (новая рэдакцыя падпунктаў 1.5 і 1.6 пункта 1). Дапаўненне ўносіцца ў пункт 3 у мэтах забеспячэння ўзгодненнасці норм Кодэкса з улікам унасімых змяненняў у артыкул 216 Кодэкса.

У **артыкуле 216 Кодэкса:**

ўдакладнены выпадкі, пры наступленні якіх арганізатар культурна-відовішчнага мерапрыемства абавязаны спыніць гэтае мерапрыемства (новая рэдакцыя падпункта 2.5 пункта 2);

па асобнасці вызначаюцца:

парадак дзеянняў арганізатара культурна-відовішчнага мерапрыемства ў выпадку змянення часу, месца правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства, замены яго другім, змянення складу ўдзельнікаў (пункт 7);

прычыны, пры якіх арганізатар мецъ права адмовіцца ад правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства (смерць, хвароба, адмова выканаўца, немагчымасць прыбыцця выканаўца без магчымай яго замены, эканамічная немэтазгоднасць, іншыя прычыны, якія структурнае падраздзяленне аблвыканкама (Мінгарвыканкама) прызнае ўважлівымі), і парадак дзеянняў арганізатара (пункт 8);

выпадак адмены культурна-відовішчнага мерапрыемства – толькі форс-мажорныя абставіны (ваенныя рызыкі, увядзенне рэжыму надзвычайнага палажэння, стыхійныя бедствы, прыродныя або

тэхнагенныя катастрофы, тэрарыстычныя акты або існаванне пагрозы тэрарыстычных актаў, пандэміі, эпідэміі і (або) звязаныя з імі забароны або абмежаванні, закрыццё дзяржаўных меж) і парадак дзеянняў арганізатара (пункт 9).

З улікам шырокага распаўсюджвання практыкі набыцця ўваходных білетаў з выкарыстаннем паслуг электронных білетных аператараў **артыкул 217 Кодэкса** дапоўнены нормамі, якія прадугледжваюць выплату кошту ўваходных білетаў без уліку камісійнага сбору электронных білетных аператараў, камісійнага збору за браніраванне ўваходнага білета і іншых выдаткаў, якія не ўваходзяць у кошт уваходнага білета, паколькі гэтыя зборы з’яўляюцца платай за аказаныя аператарамі паслугі.

Таксама прапануецца для ўдасканалення тэрміналагічнага апарата тэрмін ”выплата грашовай кампенсацыі кошту ўваходных білетаў“ замяніць на больш дакладны – ”вяртанне кошту ўваходнага білета“. Гэта выклікана тым, што кампенсацыя – гэта асобнае патрабаванне, узнікшае ў сувязі з нейкімі маёмаснымі стратамі. У выпадку набыцця білетнай прадукцыі магчыма казаць пра яе як фактычны доказ аплаты заказчыкам некаторых паслуг, якія прадстаўляюцца арганізацыямі культуры насельніцтву, а ў выпадку немагчымаці скарыстацца такімі паслугамі мае месца вяртанне іх кошту.

Вызначаюцца тэрміны звароту кошту білетаў:

30 каляндарных дзён з дня падачы заявы – у выпадках змяненняў ў правядзенні культурна-відовішчнага мерапрыемства, адмовы ад яго правядзення;

60 каляндарных дзён – пасля заканчэння дзеяння форс-мажорных абставін у выпадку адмены культурна-відовішчнага мерапрыемства.

Пункт 2 **артыкула 220 Кодэкса** па аналогіі з пунктам 1 гэтага артыкула дапаўняецца частай другой, у якой вызначаюцца мерапрыемства, якія могуць праводзіцца ў рамках свята.

Глава 22 Кодэкса дапаўняецца **артыкулам 221[1]**, у якім вызначаюцца такія віды культурных мерапрыемстваў, як конкурс прыгажосці, паказ і прэзентацыя калекцыі.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 21 лістапада 2019 г. № 423 ”О модельной деятельности“ конкурс прыгажосці аднесен да культурна-відовішчных мерапрыемстваў. Таму прадстаўляецца мэтазгодным замацаванне дадзенага віда культурнага мерапрыемства ў Кодэксе.

**Да пункта 105.**

Нормы пункта 8 **артыкула 229 Кодэкса** прыводзяцца ў адпаведнасць з заканадаўствам аб працы. Паколькі паняцце ”пасада

служачага“ вызначана ў артыкуле 1 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь і прымяняецца пры прававым рэгуляванні працоўных адносін, работа ў пасадзе можа ажыццяўляцца толькі на падставе працоўнага дагавора (кантракта). У сувязі з гэтым, з пункта 8 артыкула 229 Кодэкса выключаюцца нормы, якія прадугледжваюць магчымасць выканання работы ў пасадзе на падставе грамадзянска-прававога дагавора.

**Да пункта 106.**

Дапаўненні ў **артыкул 236 Кодэкса** вызначаюць умовы для прыняцця рашэння аб стварэнні або арганізацыі творчай дзейнасці клубных фарміраванняў. Улічваючы, што вынік і эфектыўнасць работы клубнага фарміравання як суб’екта культурнай дзейнасці не залежаць ад колькасці яго ўдзельнікаў, а падпарадкаваны ў большай ступені рэалізацыі творчых задач, дапаўненнем вызначана, што колькасць удзельнікаў клубнага фарміравання павінна адпавядаць напрамкам (школам), формам, відам і прыёмам мастацкай творчасці, вызначаным форме і зместу, жанру, рэпертуарнай палітыкі, вартасці і прызначэнню твораў мастацкай літаратуры і мастацтва, якія ствараюцца, выконваюцца, распаўсюджваюцца і папулярызуюцца пры ажыццяўленні творчай дзейнасці, садзейнічаць развіццю творчай дзейнасці клубнага фарміравання.

Адначасова, улічваючы, што змест і мэты дзейнасці гурткоў і аматарскіх аб’яднанняў (клубаў па інтарэсах) адрозніваюцца ад іншых відаў клубных фарміраванняў, устанаўліваецца мінімальная колькасць іх удзельнікаў у залежнасці ад месца іх дзейнасці: у сельскіх населеных пунктах – не менш за 5 чалавек, у іншых населеных пунктах – не менш за 10 чалавек.

Улічваючы, што заняткі ў клубным фарміраванні з’яўляюцца вынікам творчай дзейнасці яго ўдзельнікаў і вынікам выканання дамоўных адносін паміж кіраўніком клубнага фарміравання (работнікам) і яго наймальнікам, вызначана, што перыядычнасць і працягласць заняткаў у клубным фарміраванні вызначаюцца самастойна кіраўніком клубнага фарміравання і зацвярджаюцца кіраўніком юрыдычнай асобы, у структуры якой створна або на базе якой дзейнічае гэта фарміраванне.

Пункт 2 артыкула 236 Кодэкса ў мэтах забеспячэння паўнаты прававога рэгулявання па аналогіі з часткай другой пункта 4 артыкула 47 Кодэкса дапаўняецца нормай, якая ўдакладняе паняцце ”арганізацыя культуры, установа адукацыі, іншая юрыдычная асоба, на базе якой дзейнічае клубнае фарміраванне“.

У мэтах прававога замацавання практыкі дзейнасці такія клубных фарміраванняў як тэатры мод, якія актыўна ўдзельнічаюць у розных

культурных мерапрыемствах, адпаведнае дапаўненне ўносіцца ў пункт 3 артыкула 236 Кодэкса.

**Да пункта 107.**

Пуктам 1 артыкула 32 Закона № 130-З прадугледжана, што найменне дзяржаўных органаў у тэксце нарматыўнага прававога акта ўказваюцца без слоў ”Рэспублікі Беларусь“, таму ў **артыкулах 249 і 250 Кодэкса** словы ”Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь“ замяняюцца словамі ”Міністэрства адукацыі“.

**Абгрунтаванне да артыкула 2 праекта Закона.**

Праектам Закона **артыкул 207 Кодэкса** выкладаецца ў новай рэдакцыі. Пры гэтым вызначаюцца новыя падыходы да класіфікацыі фільмаў, прызначаных для паказу на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

У артыкуле $37^2$ Закона Рэспублікі Беларусь ад 19 лістапада 1993 г. № 2570-XII «О правах ребенка» змяшчаюцца нормы, якія таксама датычацца пытанняў класіфікацыі фільмаў. Таму ў мэтах забеспячэння ўзгодненнасці названых заканадаўчых актаў змяненні ўносяцца ў асобныя нормы артыкула $37^2$ Закона Рэспублікі Беларусь «О правах ребенка».

**Абгрунтаванне да артыкула 3 праекта Закона.**

Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 24 чэрвеня 2011 г. № 23 ”Об установлении перечня видов культурных ценностей, освобождаемых от налога на добавленную стоимость при их ввозе на территорию Республики Беларусь, а также при реализации на территории Республики Беларусь“ (далей – пастанова № 23) была распрацавана ў адпаведнасці з падпунктамі 2.1 і 2.2 пункта 2, для выканання пункта 7 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2011 г № 145. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 ліпеня 2012 г. № 312 названыя падпункты былі выключаны і пытанні падаткаабкладання абаротаў па рэалізацыі культурных каштоўнасцей на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь культурных каштоўнасцей былі выведзены з-пад дзеяння Указа № 145 і, такім чынам, зніклі прававыя падставы для прымянення норм пастановы № 23.

Падставай для вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць, у тым ліку пры ўвозе тавараў, якія адносяцца да культурных каштоўнасцей, з’яўляецца заключэнне Міністэрства культуры аб аднясенні тавараў да культурных каштоўнасцей. Названае заключэнне выдаецца ў дачыненні тавараў, якія ўключаны ў раздзел 2.20 ”Культурныя каштоўнасці, дакументы нацыянальных архіўных фондаў, арыгіналы архіўных дакументаў“ пераліку тавараў, у дачыненні якіх

вызначаны дазвольны парадак увозу на мытную тэрыторыю Еўразійскага эканамічнага саюза і (або) вывазу з мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза, зацверджанага Рашэннем Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі ад 21 красавіка 2015 г. № 30 ”О мерах нетарифного регулирования“ (далей – пералік 2.20). Пералік культурных каштоўнасцей, зацверджаны пастановай № 23, у значнай меры дубліруе найменне тавараў з пераліку 2.20. Каб пазбегнуць лішніх норм, мэтазгодна спасылацца на пералік тавараў, зацверджаны міжнародным дакументам, і ў далейшым для мэт аптымізацыі колькасці нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць пытанні аднясення тавараў, якія ўвозяцца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, да катэгорыі культурных каштоўнасцей, прызнаць названую пастанову страціўшым сілу.

У адпаведнасці з часткай другой пункта 1 артыкула 3 Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей – ПК) уключэнне палажэнняў, якія рэгулююць пытанні падаткаабкладання, у другія акты заканадаўства забараняецца, калі іншае не вызначана гэтым Кодэксам або Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, у сувязі гэтым ўключэнне такіх палажэнняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры з'яўляецца немагчымым. Пры гэтым варта адзначыць, што ў цяперашні час ад дзяржаўнай пошліны за выдачу пасведчання на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь вызваляюцца арганізатары культурна-відовішчных мерапрыемстваў з удзелам толькі беларускіх выканаўцаў і дзяржаўныя арганізацыі культуры (падпункт 10.30 пункта 10 артыкула 285 ПК). Паколькі праектам прапануецца даць дзяржаўным арганізацыям культуры права правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў без атрымання такога пасведчання, выключэнню з ПК падлягае таксама ільгота па дзяржаўнай пошліне для гэтых арганізацый, а, у сваю чаргу, ільгота для арганізатара культурна-відовішчнага мерапрыемства з удзелам толькі беларускіх выканаўцаў прывязана да самага мерапрыемства, а не да суб'ектнага складу плацельшчыкаў дзяржаўнай пошліны. Такім чынам, незалежна ад колькасці арганізатараў мерапрыемства, калі ў такім мерапрыемстве прымаюць удзел толькі беларускія выканаўцы, ільгота па дзяржаўнай пошліне будзе давацца кожнаму з яго арганізатараў.

З улікам практыкі работы тэатральна-відовішчных арганізацый у эпідэмічнай сітуацыі ў законапраект уключаны артыкул $215^1$, які рэгламентуе пытанні дзеяння гастрольных пасведчанняў пры наступленні форс-мажорных абставін. Так у выпадку, калі ў выніку форс-мажорных абставін правядзенне культурна-відовішчнага мерапрыемства робіцца немагчымым, структурнаму падраздзяленню мясцовага выканаўчага і распарадчага органа абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню,

якое ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, якое выдала пасведчанне на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, прадстаўляецца права на падставе заявы арганізатара мерапрыемства прызнаць выдадзенае пасведчанне несапраўдным. Прызнанне несапраўдным пасведчання служыць падставай для вяртання або заліку дзяржайнай пошліны ў полным аб'ёме. Для замацавання гэтага права праектам Закона прапанавана ўнесці адпаведнае дапаўненне ў артыкул 292 ПК.

**Абгрунтаванне да артыкула 4 праекта Закона.**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 ліпеня 2004 г. № 300-З ”Об архитектурной, градостроительной и строительной деятельности в Республике Беларусь“ (далей – Закон № 300-З) з'яўляецца асноўным нарматыўным прававым актам, які рэгулюе будаўнічую дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь, уключаючы рэстаўрацыю аб'ектаў, выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ. Аб'ектамі, на якіх выконваюцца рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы, з'яўляюцца нерухомыя матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Адначасова, рэгуляванне дадзеных пытанняў прадугледжана таксама ў Кодэксе, у якім канкрэтызуюцца і раскрываюцца віды рамонтна-рэстаўрацыйных работ, якія выконваюцца на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях (артыкул 114 Кодэкса). Пры гэтым мае месца няўзгодненасць паміж Законам № 300-З і Кодэксам у частцы тэрміналогіі.

У мэтах выключэння няўзгодненасці заканадаўства аб культуры з заканадаўствам аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці законапраектам прапануецца ў Законе № 300-З:

у артыкуле 1:

унесці змяненні ў азначэнне тэрміну ”архитектурная деятельность“;

увесці тэрмін ”ремонтно-реставрационные работы, выполняемые на материальных историко-культурных ценностях“;

тэрмін, вызначаны ў абзацы трыццаць пятым, выключыць;

артыкул $1^1$ дапоўніць нормамі, якія прадугледжваюць, што асаблівасці ажыццяўлення рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях устанаўліваюцца заканадаўствам аб культуры.

**4. Вынікі аналізу:**

**4.1. актаў заканадаўства, якія адносяцца да прадмета прававога рэгулявання праекта, і практыкі іх прымянення**

Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь

За выдачу пасведчання, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам, арганізатар культурна-відовішчнага мерапрыемства выплачвае дзяржаўную пошліну ў памеры, установленым пунктам 103 дадатку 22 да Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Парадак выплаты дзяржаўнай пошліны за выдачу пасведчання на правядзенне культурна-відовішчнага мерапрыемства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь установлены артыкуламі 284, 285, 290 Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь, падставы для вяртання або заліку дзяржаўнай пошліны – артыкулам 292 Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Разам з тым у названых артыкулах не рэгламентаваны выпадкі анулявання пасведчання ці прызнання несапраўдным і, адпаведна, вяртання або заліку дзяржаўнай пошліны ў выпадку наступлення форс-мажорных абставін.

Закон № 300-З у частцы тэрміналогіі неабходна ўзгадніць з Кодэксам.

Указ Прэзідэнта Республікі Беларусь ад 21 лістапада 2019 г. № 423 ”О модельной деятельности“, якім конкурс прыгажосці аднесен да культурна-відовішчных мерапрыемстваў. У мэтах узгаднення дадзенага акта Прэзідэнта Республікі Беларусь з Кодэксам глава 22 Кодэкса дапаўняецца новым артыкулам;

**4.2. актаў заканадаўства замежных дзяржаў, якія адносяцца да прадмета прававога рэгулявання праекта, і практыкі іх прымянення:** няма;

**4.3. міжнародных дамоваў Рэспублікі Беларусь і іншых міжнародна-прававых актаў, якія змяшчаюць абавязацельствы Рэспублікі Беларусь, якія адносяцца да прадмета прававога рэгулявання праекта, і практыкі іх прымянення:** рашэнне Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі ад 21 красавіка 2015 г. № 30 ”О мерах нетарифного регулирования“ (у дачыненні пытанняў увоза, вываза культурных каштоўнасцей);

**4.4. на прадмет адпаведнасці праекта міжнародным дагаворам і іншым міжнародна-прававым актам, якія адносяцца да адпаведнай сферы прававога рэгулявання:** няма.

**5. Інфармацыя, якая адлюстроўваецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 г. № 421-З ”О международных договорах Республики Беларусь“**

Канвенцыя аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны 1972 г., Канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны 2003 г., рэкамендацыі па выкананні гэтых канвенцый.

**6. Вынікі навуковых даследаванняў у галіне права, публікацыі ў сродках масавай інфармацыі, глабальнай камп’ютэрнай сетцы**

**Інтэрнэт, звароты грамадзян і юрыдычных асоб, якія адносяцца да прадмета прававога рэгулявання праекта:** пры падрыхоўцы праекта Закона ўлічваліся звароты грамадзян, якія тычацца пытанняў арганізацыі і правядзення культурных мерапрыемстваў, і юрыдычных асоб, якія тычацца аднясення зарэгістраваных грамадзянскіх аб'яднанняў да ліку творчых саюзаў.

**7. Усебаковы і аб'ектыўны прагноз меркаваных наступстваў прыняцця (выдання) нарматыўнага прававога акта, у тым ліку адпаведнасць праекта сацыяльна-эканамічным патрэбам і магчымасцям грамадства і дзяржавы, мэтам ўстойлівага развіцця, а таксама вынікі ацэнкі рэгулюючага уздзеяння**

Праект Закона дазваляе скарэктаваць Кодэкс з улікам існуючых умоў, забяспечыць эфектыўнае функцыянаванне арганізацый культуры ў сучасных абставінах. Праект Закона не ўплывае на прававы статус грамадзян, працэс іх узаемадзеяння з дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі). Яго прыняцце адпавядае сацыяльна-эканамічным патрэбам і магчымасцям грамадства і дзяржавы, мэтам устойлівага развіцця, і не прывядзе да ўзнікнення якіх-небудзь негатыўных сацыяльных і экалагічных наступстваў, звязаных з яго рэалізацыяй.

**8. Інфармацыя аб выніках публічнага абмеркавання праекта і разгляду заўваг і (або) прапаноў якія паступілі пры гэтым**

Праект Закона быў накіраваны на абмеркаванне шырокаму колу арганізацый і ўстаноў культуры, грамадскіх аб'яднанняў у сферы культуры і аховы гісторыка-культурнай спадчыны, якія прымалі актыўны ўдзел у рабочых групах Міністэрства культуры па фарміраванні выніковага тэксту Кодэкса, дзе былі ўлічаны прапановы, якія паступілі ад іх.

Акрамя таго, праект Закона для грамадскага абмеркавання размешчаны ў глабальнай сетцы Інтэрнэт на сайце ”Правовой форум Беларуси“.

Заўваг і прапаноў па выніковым тэксце праекта Закона ад названых грамадскіх аб'яднанняў (у тым ліку аб'яднанняў прадпрымальнікаў) не паступіла.

Такім чынам, у праект Закона ўключаны новыя нормы, якія патрабуюць свайго замацавання і рэалізацыі з улікам існуючай правапрымяняльнай практыкі, улічаны паступілі шматлікія прапановы ад арганізацый культуры, прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў у сферы культуры, у тым ліку аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

**9. Кароткі змест змяненняў, якія падлягаюць унясенню ў нарматыўныя прававыя акты, праектаў, якія падлягаюць падрыхтоўцы, а таксама пералік нарматыўных прававых актаў (іх**

**структурных элементаў), якія падлягаюць прызнанню страціўшымі сілу ў сувязі з прыняццем (выданнем) нарматыўнага прававога акта**

У сувязі з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь ”Аб змяненні законаў па пытаннях культуры“ падлягаюць:

**змяненню:**

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 красавіка 2010 г. № 200 ”Об административных процедурах, осуществляемых государственными органами и иными организациями по заявлениям граждан“;

пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь:

ад 23 верасня 2008 г. № 1397 “О некоторых вопросах порядка перемещения отдельных видов товаров через государственную границу Республики Беларусь”;

ад 8 кастрычніка 2008 г. № 1476 “Об утверждении Положения о порядке разработки, согласования и утверждения градостроительных проектов, проектной документации”;

ад 6 чэрвеня 2011 г. № 716 “Об утверждении Положения о порядке приемки в эксплуатацию объектов строительства”;

ад 17 лютага 2012 г. № 156 ”Об утверждении единого перечня административных процедур, осуществляемых государственными органами и иными организациями в отношении юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, внесении дополнения в постановление Совета Министров Республики Беларусь и признании утратившими силу некоторых постановлений Совета Министров Республики Беларусь“;

ад 2 кастрычніка 2015 г. № 263 ”О проведении на территории Республики Беларусь отдельных централизованных культурных мероприятий“;

ад 25 кастрычніка 2016 г. № 871 ”О мерах по реализации Закона Республики Беларусь от 11 мая 2016 года ”О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь“;

ад 17 студзеня 2017 г. № 40 ”Вопросы Министерства культуры“;

**падрыхтоўцы** пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь:

аб зацвярджэнні парадку, умоў выдачы заключэння (дазвольнага дакумента) на вываз культурных каштоўнасцей, уключаных у адзіны пералік тавараў, а таксама падставы для адмовы ў выдачы заключэння (дазвольнага дакумента);

**падрыхтоўцы** пастановы Міністэрства культуры:

аб вызначэнні парадку складання, вядзення і захавання пашпарту непрафесійнага (аматарскага) калектыву мастацкай творчасці;

аб зацвярджэнні формы прапановы аб наданні нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці;

аб унясенні змяненняў у пастановы Міністэрства культуры ад 28 снежня 2016 г. № 89 ”Аб устанаўленні форм пашпарта матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці і ахоўнай дошкі і прызнанні страціўшымі сілу некаторых пастаноў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь“ і ад 28 снежня 2016 г. № 90 ”Аб устанаўленні формы ахоўнага абавязацельства“;

аб складзе і парадку распрацоўкі праектаў зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей;

аб патрабаваннях да праграмы работ па бягучым рамонце на нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці;

аб зацвярджэнні формы рэстаўрацыйнага задання на распрацоўку навукова-праектнай дакументацыі і правядзенне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці;

аб зацвярджэнні формы навукова-рэстаўрацыйнай справаздачы аб выкананых работах, складзенай асобай, на якую ўскладзены абавязак кіраўніцтва навукова-праектнай дакументацыі;

аб зацверджэнні Палажэння аб саветах па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны;

аб парадку арганізацыі бібліятэчных фондаў і выключэнні з іх дакументаў;

**прызнанню страціўшымі сілу:**

загад Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 28 жніўня 1998 г. № 300 ”Аб зацвярджэнні інструкцыі па ўліку і захаванасці бібліятэчных фондаў у Рэспубліцы Беларусь“;

пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 24 чэрвеня 2011 г. № 23 ”Об установлении перечня видов культурных ценностей, освобождаемых от налога на добавленную стоимость при их ввозе на территорию Республики Беларусь, а также при реализации на территории Республики Беларусь“;

пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 1 снежня 2016 г. № 63 ”Аб устанаўленні формы пашпарта непрафесійнага (аматарскага) калектыву мастацкай творчасці“.

Міністр культуры
Рэспублікі Беларусь А.М.Маркевіч